ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ЧАЦВЕР
10 чэрвеня
1993 года
№ 10(1697)

АДКРЫВАЕМ АМЕРЫКУ

ВОСЬ І НА СУСЕДНЯЙ ВУЛІЦЫ СВЯТА

Амерыканскі фонд Сораса і яго афіцыйны прадстаўнік Элізабэт СМЕДЛІ на працягу красавіка месяца праводзілі тэсціраванне навучэнцаў 15 школ горада Мінска. І вось, нарэшце, прыйшоў адказ з Вашынгтона, куды быў дасланы пакет з вынікамі тэсціравання і анкетамі ўдзельнікаў.

Сярод 50 шчасліўчыкаў і чацвёра навучэнцаў ліцэя пры Беларускім дзяржаўным універсітэце: Павел Запрудскі, Васіль Вашчанка, Уладзімір Каткоўскі. Мілана Шушкевіч.

З верасня яны пачнуць сваю вучобу ў амерыканскіх каледжах. Навучанне працягнецца год. Школьнікі будуць атрымліваць стыпендыю, якая дазволіць ім пазбегнуць няёмкасцей савецкага турыста за мяжой. Акрамя таго, запланаваны прыезд на радзіму пад час калядных вакацый. З пражываннем таксама няма ніякіх праблем, а хутчэй наадварот. Сярод амерыканскіх сем'яў, якія жадаюць прыняць у сябе замежных гасцей, нават аб'яўлены конкурс. Усе выдаткі на навучанне, праезд, харчаванне фонд Сораса бярэ на свой рахунак.

На вяртанню былыя навучэнцы Мінскага ліцэя пры БДУ і амерыканскіх каледжаў стануць, калі пажадаюць, канешне, студэнтамі універсітэта.

НАЗІРАННІ...

... З КУЗНІ ШПАРГАЛАК

Студэнт, напэўна, ніколі і не задумваўся, адкуль бяруцца папулярныя (асабліва падчас залікаў і экзаменаў) «метадычкі», якія дапамагаюць сур'ёзнаму вывучэнню матэрыяла, а часам, што хавацца, выконваюць ролю шпаргалкі.

Справа ў тым, што ужо некалькі гадоў у БДУ працуе рэдакцыйна-выдавецкая група, якая сумесна з лабараторыяй памнажальнай тэхнікі выдае ўсе метадычныя дапаможнікі і рэкамендацыі. За мінулы 1992 год рэдакцыйна-выдавецкай групай па заказу розных кафедраў універсітэта было падрыхтавана да выдання больш за 140 метадычных выданняў. З уласных назіранняў работнікаў выдавецкай групы, самымі актыўнымі заказчыкамі на іх прадукцыю з'яўляюцца фізікі, эканамісты і матэматыкі. Якія вызначаюцца і па другім паказчыку — ахвотна выкладаюць свой матэрыял, як патрабуе таго закон, на беларускай мове. Астатнія кафедры карыстацца дзяржаўнай мовай у сваіх метадычных выданнях не спяшаюцца.

Але магчыма, такім спосабам фізікі і матэматыкі змагаюцца з выкарыстаннем «метадычкі» у якасці шпаргалкі. Бо цяпер трэба прачытаць яе не раз і як след разабрацца пры дапамозе руска-беларускага слоўніка, перакласці, а потым спісваць ужо няма сэнсу.

ЛЕПШ ПОЗНА, ЧЫМ НІКОЛІ

ПАДТРЫМКА ІДЗЕ

У 1992—1993 навучальным годзе на кафедры радыяцыйнай хіміі БДУ пачалі рыхтаваць спецыялістаў па аналізу і ўздзеянню радыяцыйных элементаў. Пра гэта наша экспрэс-інтэрв'ю з загадчыкам кафедры радыяцыйнай хіміі Яўгенам Пятровічам ПЯТРАЕВЫМ.

— Яўген Пятровіч, вострая патрэба ў спецыялістах па пытаннях радыяцыі ўзнікла яшчэ ў 1986 годзе. Вы пачалі іх рыхтаваць толькі ў 1992?

— Стварэнне групы спецыялістаў па аналізу і ўздзеянню радыяцыйных элементаў ініцыявала нашай кафедры. І пакуль мы «прабілі» сваю прапанову ва ўсіх інстанцыях: міністэрствах, рэктараце, дэканаце — прайшло шмат часу. У выніку, першы выпуск нашых навучэнцаў будзе толькі ў наступным годзе.

— Якія спецыяльныя дысцыпліны выкладаюцца вашым студэнтам?

— Акрамя асноўных — уздзеянне і хімічнага аналізу радыяцыйных элементаў — статыстыка радыяцыйных вымярэнняў, радыеметрыя, радыёбіялагічнае ўздзеянне выпраменьвання (вывучэнне працэсаў на малекулярным і іншых узроўнях). Са студэнтамі займаюцца вельмі кваліфікаваныя спецыялісты. Такія, як прафесар Алег Іосіфавіч ШАДЫРА, прафесар Юрый Пятровіч ДАВЫДАЎ, дацэнт Валерый Іванавіч ГЯРГАЕЎ. Практычныя заняткі праводзяцца непасрэдна ў лабараторыі радыяцыйнай хіміі. І з ўсёй адказнасцю магу вас запэўніць, што абсталявана яна на вышэйшым узроўні сучаснымі прыладамі з Германіі, Злучаных Штатаў, Японіі. Штосьці з гэтага абсталявання нам падарылі, штосьці закуплена за мяжой. А ўвогуле, гэта таксама заслуга кафедры.

— Яўген Пятровіч, ваш першы выпуск, сем чалавек, ён не згубіцца ў моры нашай агульнай неадукаванасці ў тым, што звязана з радыяцыяй?

— Такія спецыялісты не губляюцца. Тым больш, што кожны год мы будзем дасылаць ім падтрымку.

ВЫ ЧУЛІ?

І. ПАПОВА.

НЕ ХАДЗІЦЕ, ДЗЕЦІ...

Лета — пара, калі павышаецца прыродны ўзровень радыяцыйнага фону. Сонца становіцца больш агрэсіўным і пачынае апраменьваць нас, і без таго стомленых у барацьбе з радыяцыяй, з большай сілай. Разумеючы, што ніхто не адмовіцца ад задавальнення падрумяніцца на сонцы, мы прапануем вам іншы шлях — радзей з'яўляцца ў тых месцах, што вызначаюцца павышаным узроўнем радыяцыі. А іх ва універсітэце не так ужо шмат. Па-першае, гэта лабараторыі фізікаў, біёлагаў і хімікаў. Асабліва хімікаў. (у адной з іх знаходзіцца магутная гама-ўстаноўка). Па-другое, уваход галоўнага корпуса, асабліва з боку плошчы Незалежнасці, ўпрыгожаны мармурам, які ад прыроды вельмі ўспрымальны да радыяцыі. Таму ўзровень радыяцыйнага фону на ўваходзе складае недзе 40 мк/рэнтген у гадзіну. Гэта не вельмі страшна, бо пад такое апраменьванне вы падпадаеце на паўднёвым сонцы. Але ўсё ж такі лепей абыходзіць мармуровыя ўваходы, прыступкі і помнікі.

ПРАГНОЗ НА ЗАЎТРА

ДЗЕ МАТЭМАТЫКІ НЕ ПРАПАДАЛІ

Ужо некалькі гадоў, як у сістэме вышэйшай адукацыі не існуе размеркавання ў былым сэнсе гэтага слова. Уладкоўвацца на працу студэнтам дапамагаюць іншымі спосабамі.

На першым і другім курсах факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі ўжо два гады вядуцца заняткі па спецыяльнасці «Эканамічная кібернетыка» (на спецыялістаў гэтага профілю сёння ў рэспубліцы існуе вялікі попыт). Для старшакурснікаў, якія не мелі ў свой час магчымасці займацца па гэтай спецыяльнасці, арганізаваны курсы з выкладаннем эканамічных дысцыплін. І выпускнікі ФПМІ па жаданню могуць атрымаць сертыфікат матэматыка-эканаміста. Арганізаваныя курсы па ініцыятыве дэкана факультэта, але ідэя належыць самім студэнтам. І таксама па іх жаданню на пятым курсе матэматыкам дадзена магчымасць набыць педагагічную адукацыю. Справа ў тым, што ў сярэдніх школах ужо даўно ўведзена новая дысцыпліна «Асновы інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі», а сур'ёзных спецыялістаў сярод настаўнікаў не шмат. Таму дыплом студэнта ФПМІ з прыпіскай аб атрыманні педагагічнай адукацыі — гэта гарантыя ўладкавання на працу.

Але, як паказвае вопыт, асаблівых цяжкасцей з уладкаваннем матэматыкі і не адчуваюць. Яны нават не заўсёды згаджаюцца на прапановы універсітэта, а знаходзяць больш высокааплачваемую працу. Абсалютная большасць выпускнікоў мінулага года працуе не ў дзяржаўных установах, а ў кааператывах, сумесных прадпрыемствах, прыватных фірмах.

ПА-ЗА КАНКУРЭНЦЫЯЙ

НЕ Ў ГРОШАХ ШЧАСЦЕ

Скончаны прыём заяў на завочную форму навучання ва універсітэце.

Як высветлілася, па колькасці заяў, пададзеных на кожны канкрэтны факультэт, можна прасачыць агульныя тэндэнцыі развіцця нашага грамадства.

Да прыкладу, на філалагічным факультэце не існуе з гэтага года рускамоўнае аддзяленне на завочнай форме навучання. А пасля першага экзамена на спецыяльнасці «Беларуская мова і літаратура», здаўшы экзамен на «2» балы, «адсеялася» палова абітурыентаў.

Падае колькасць жадаючых займацца прыродазнаўчымі праблемамі. Матэматыка і фізіка патрабуюць вялікай працаздольнасці, дакладнасці і часу. А каму сёння, калі грошы можна зарабіць і лягчэй, і хутчэй, такая валынка патрэбна? Таму на мехмат пададзена 23 заявы на 25 месцаў.

Колькасць заяў, пададзеных на спецыяльнасць «Паліталогія», супала з колькасцю месцаў: 20 на 20 — як у аптэцы. Па-ранейшаму трымае марку журфак — на 20 месцаў 40 жадаючых.

Самы высокі рэйтынг, як заўсёды, у юрыдычнага факультэта: 308 жадаючых на 100 месцаў. Амаль такі ж конкурс і на біялагічным факультэце: 189 заяў на 50 вакансій. Ужо не першы год гэта спецыяльнасць лічыцца адной з самых прэстыжных.

Для платнага атрымання другой вышэйшай адукацыі ў гэтым годзе планавалася набраць 200 чалавек. Аднак жадаючых апынулася намнога больш — 378. Прычым, 359 з іх імкнуцца атрымаць юрыдычную спецыяльнасць, а на журналістыку і палітэканомію — жадаючых няма.

ДОШКА АБ'ЯЎ

Асацыяцыя студэнтаў і навучэнцаў Беларусі запрашае адпачыць 15 дзён на ўзбярэжжы Чорнага мора ў Балгарыі з наведваннем Турцыі (з ліпеня па лістапад).

Прыблізны кошт—225 долараў ЗША і 27 тысяч рублёў (дзеці да 3 год адпачываюць бясплатна, старэйшым — прадастаўляецца значная ільгота ў аплаце).

Звяртацца па тэлефоне 26-71-86 з 10 да 17 гадзін, 61-98-82 з 19 да 21 гадзіны.

ДА НАС ПА СПРАВАХ

З ДАПАМОГАЙ ПОЛА МОРА

Амерыканец **Пол МОР** і яго сям'я добра вядомыя на Беларусі, дзякуючы сваім клопатам па арганізацыі дабрачыннай дапамогі дзецям, якія пакутуюць ад Чарнобыля.

23 мая ў рэспубліцы пачалася аперацыя «Надзея-экспрэс-2», пад час якой будзе дастаўлена 12,5 тон дзіцячага харчавання, масла, мукі, медыкаментаў. Па словах Пола Мора, гуманітарны груз будзе размеркаваны па канкрэтных адрасах. Частку харчавання плануецца прадаць, а сабраныя грошы трапяць на спецыяльны дабрачынны рахунак.

НА ЗДЫМКАХ: На канцэрце ў Мінскім Палацы моладзі, прысвечаным пачатку акцыі «Надзея-экспрэс-2».

КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР
ПРАФСАЮЗНАГА КАМІТЭТА І АДМІНІСТРАЦЫІ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА НА 1993 ГОД

РАЗДЗЕЛ І. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Гэты калектыўны дагавор, пасля папярэдняга абмеркавання ў падраздзяленнях, заключаецца паміж калектывам супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта, які прадстаўлены прафсаюзным камітэтам, і адміністрацыяй універсітэта, якая прадстаўлена рэктарам. Калектыўны дагавор заключаецца тэрмінам на адзін год і ўступае ў дзеянне з моманту падпісання яго абодвума бакамі. Асноўнымі прынцыпамі заключэння калектыўнага дагавору з'яўляецца сацыяльнае партнёрства і раўнапраўе бакоў.

Прынятыя палажэнні дагавору распаўсюджваюцца на ўсіх членаў калектыву. Адміністрацыя абавязуецца знаёміць з гэтым калектыўным дагаворам кожнага, хто паступае на работу. Адміністрацыя і прафкам абавязуюцца праз месяц з дня прыняцця дагавору памножыць яго і давесці да ўсіх службаў універсітэта і прафсаюзных арганізацый.

1.2. Адміністрацыя, у асобе рэктара універсітэта, і прафсаюзны камітэт, у асобе старшыні прафкама, абавязуюцца забяспечыць бесперапынны кантроль за выкананнем усіх умоў дагавору.

1.3. Прамежкавыя справаздачы аб ходзе выканання калектыўнага дагавору заслухоўваюцца раз у паўгода на сумесных пасяджэннях рэктарата і прафкама з запрашэннем адказных і зацікаўленых асоб. Справаздачу аб выніках выканання абавязацельстваў за год адміністрацыя і прафкам універсітэта праводзяць на канферэнцыі працоўнага калектыву.

1.4. Адміністрацыя і прафкам абавязуюцца інфармаваць супрацоўнікаў універсітэта аб усіх рашэннях, якія прымаюцца: размеркаванне жылля, фондавага абсталявання, прэміраванне і г. д.

1.5. Пры невыкананні палажэнняў калектыўнага дагавору, паўторным парушэнні тэрмінаў выканання абавязацельстваў прафкам, канферэнцыя працоўнага калектыву разглядаюць пытанне аб адпаведнасці займаемай пасадзе адказнага выканаўцы.

РАЗДЗЕЛ ІІ. ПАЛЯПШЭННЕ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ УМОЎ СУПРАЦОЎНІКАЎ

2.1. Адміністрацыя і прафкам універсітэта абавязуюцца пастаянна кантраляваць ход будаўніцтва 120-кватэрнага жылога дома па вуліцы Варанянскага.

Адк.: рэктар, старшыня прафкама.

2.2. Адміністрацыя і прафкам універсітэта абавязуюцца выканаць усю неабходную работу ў 1993 годзе дзеля забеспячэння пачатку будаўніцтва дома для супрацоўнікаў па вуліцы Аэрадромнай.

Адк.: рэктар, старшыня прафкама.

2.3. Выдзеліць са сродкаў фонду навукова-тэхнічнага і сацыяльнага развіцця БДУ 1,5 млн. рублёў для аплаты — ў памеры 70 працэнтаў кошту пуцёвак, што набываюцца супрацоўнікамі самастойна.

Адк.: галоўны бухгалтар, старшыня прафкама.

2.4. Аплочваць са сродкаў сацыяльнага страхавання санаторныя пуцёўкі, якія выдаюцца супрацоўнікам універсітэта, у памеры 95 працэнтаў ад іх кошту.

Адк.: галоўны бухгалтар, старшыня прафкама.

2.5. Аказваць матэрыяльную дапамогу малазабяспечаным сем'ям, якія маюць дзяцей і даход на аднаго члена сям'і, што не перавышаў бы дзвюх мінімальных заработных плат, адзін раз у год у памеры аднаго акладу па займаемай пасадзе.

Адк.: галоўны бухгалтар, агульна-прававы аддзел.

2.6. Дазволіць кіраўнікам структурных падраздзяленняў універсітэта ў адпаведнасці з арт. 5 КЗаП Рэспублікі Беларусь, прадастаўляць працуючым жанчынам, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 14 год, адзін раз у месяц дадатковы выхадны з захаваннем заработнай платы.

Адк.: начальнік аддзела кадраў.

2.7. Жанчынам, якія маюць дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 год, прадастаўляць дадатковы неаплочваемы адпачынак з захаваннем месца работы (пасады).

Адк.: аддзел кадраў, агульна-прававы аддзел.

2.8. У адпаведнасці з арт. 76 КЗаП РБ прадаставіць права адміністрацыі даваць неаплочваемы адпачынак працягласцю да аднаго месяца асобам вучэбна-дапаможнага і абслугоўваючага персаналу ў ліпені-жніўні 1993 года.

Адк.: рэктарат.

2.9. Аказваць супрацоўнікам і студэнтам матэрыяльную дапамогу (з фонду сацыяльнай дапамогі рэктара і прафкама).

Адк.: рэктарат, старшыня прафкама.

2.10. Пры прадастаўленні супрацоўнікам чарговага адпачынку выплочваць лячэбную дапамогу ў памеры, які залежыць ад эканоміі фонду аплаты працы.

Адк.: рэктарат.

2.11. Выплочваць аднаразовую дапамогу:

— калі супрацоўнік уходзіць на пенсію, у памеры месячнага акладу па займаемай пасадзе;

— сям'і памёршага супрацоўніка, а таксама пры смерці блізкіх сваякоў, якія былі на ўтрыманні супрацоўнікаў універсітэта, у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

Адк.: рэктарат, прафкам.

РАЗДЗЕЛ ІІІ. АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ, НАРМІРАВАННЕ, ЗАКЛЮЧЭННЕ І СКАСАВАННЕ ПРАЦОЎНЫХ ДАГАВОРАЎ

3.1. Адміністрацыя ўніверсітэта ажыццяўляе раўнамерную загрузку выкладчыкаў па семестрах, не дапускае больш 6 аўдыторных гадзін па асноўнай пасадзе, 9 гадзін з улікам сумяшчальніцтва, правядзення больш аднаго экзамена ў дзень.

Работу ў выхадныя дні дазваляць у выключных выпадках, афармленне яе праводзіць у адпаведнасці з КЗаП па заяве выкладчыка.

Адк.: рэктарат, дэканы факультэтаў.

3.2. Устанавіць аб'ём вучэбнай нагрузкі ў разліку на выкладчыка ў сярэднім 720 гадзін, пры тым, лекцыйна-семінарская нагрузка павінна быць не менш за 130 гадзін. Перавыкананне вучэбнай нагрузкі аплочваць ва ўстаноўленым парадку.

Да ўдакладнення сярэдняй вучэбнай нагрузкі звярнуцца ў верасні 1993 года, з улікам прапаноў вучэбна-метадычнага ўпраўлення.

Адк.: рэктарат.

3.3. Дазволіць штатным супрацоўнікам БДУ па рашэнні кафедры выкананне пагадзінай вучэбнай нагрузкі да 0,5 штатнай вучэбнай нагрузкі.

Адк.: вучэбна-метадычнае ўпраўленне.

3.4. Забяспечыць умовы павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў па вылічальнай тэхніцы, вывучэнню беларускай мовы і замежных моў у адпаведнасці з планамі падраздзяленняў.

Адк.: рэктарат.

3.5. Устанавіць аб'ём аўдыторных вучэбных заняткаў у 1993—1994 навучальным годзе не больш за 36 гадзін у тыдзень.

Адк.: дэканы факультэтаў.

3.6. Звальненне супрацоўнікаў, якія не дасягнулі пенсійнага ўзросту, па скарачэнні колькасці ці штатаў работнікаў не дапускаецца, калі магчымы перавод па іх згодзе на іншыя пасады, што займаюцца асобамі, якія маюць права на поўную пенсію.

Адк.: аддзел кадраў, агульна-прававы аддзел.

3.7. Звальненне супрацоўнікаў па ініцыятыве адміністрацыі ў выпадку грубага парушэння працоўнай дысцыпліны (арт. 33 КЗаП РБ), а таксама па дасягненні пенсійнага ўзросту праводзіцца з абавязковым паведамленнем у прафкам. У астатніх выпадках са згоды прафкама.

Адк.: аддзел кадраў.

3.8. Прадаставіць адміністрацыі права афармлення на работу супрацоўнікаў універсітэта, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, і тых, хто прымаецца нанова — па дагаворы.

Адк.: рэктарат, старшыня прафкама.

3.9. Пры звальненні супрацоўнікаў па скарачэнні колькасці ці штату работнікаў памер выхадной дапамогі павялічваецца на 10 працэнтаў сярэднемесячнага заработку за кожны год працы ва універсітэце звыш 5 год.

Адк.: галоўны бухгалтар.

3.10. Аплату працы праводзіць у адпаведнасці з зацверджанымі стаўкамі і акладамі з 4 па 6 і з 16 па 18 даты кожнага месяца, а ў выпадку супадзення названых дат з выхаднымі днямі — у дні, папярэднія выхадным.

Забяспечыць атрыманне заработнай платы праз ашчадны банк (па заявах) да 12 даты кожнага месяца.

Кожны квартал даводзіць да ведама падраздзяленняў аб дэпаніраваных выплатах (сумах).

Выплату стыпендыі студэнтам і аспірантам ажыццяўляць у адпаведнасці з распараджэннямі па факультэтах з 15 па 17 даты кожнага месяца, а ў выпадку супадзення названых дат з выхаднымі дні — у дні, папярэднія ім.

Адк.: галоўны бухгалтар, дэканы факультэтаў.

3.11. Выдачу разліковых лісткоў ажыццяўляць па ўсіх відах заработнай платы.

Адк.: галоўны бухгалтар, дырэктар вылічальнага цэнтра.

3.12. За паспяховае выкананне і перавыкананне тэматычнага плана работ на аснове загаду, які выдаецца не пазней 30 красавіка, выплочваць прэміі. Памеры прэміі і спісы прэміраваных узгадняюцца з прафсаюзнымі арганізацыямі кафедраў, лабараторый, факультэтаў і службаў.

Адк.: галоўны бухгалтар, старшыня прафкама.

3.13. Выплату аднаразовай матэрыяльнай дапамогі студэнтам ажыццяўляць па меры паступлення заяў.

Адк.: галоўны бухгалтар.

3.14. Аплочваць супрацоўнікам, як пагадзінную аплату, заняткі, якія праводзяцца імі за выкладчыкаў, якія знаходзяцца на лячэнні па лістках непрацаздольнасці (пры ўмове здачы гэтых лісткоў у бухгалтэрыю).

Адк.: галоўны бухгалтар.

3.15. Па рабочых пасадах праводзіць даплаты за сумяшчэнне прафесій (пасад), пашырэнне зоны абслугоўвання ці павелічэнне аб'ёму выконваемых работ у межах да 100 працэнтаў сродкаў, па вакантнай пасадзе (тарыфнай стаўцы) прапарцыянальна фактычна выкананай рабоце.

Адк.: галоўны бухгалтар.

3.16. Устанавіць даплату ў памеры 10 працэнтаў ад мінімальнага заработку прыбіральшчыцам, якія прыбіраюць туалеты.

Адк.: планава-фінансавы аддзел.

3.17. Пры недастатковым фондзе аплаты працы ў падраздзяленнях навукова-даследчай часткі прадаставіць адміністрацыі права пераводзіць супрацоўнікаў на няпоўны рабочы дзень, няпоўны рабочы тыдзень, з аплатай прапарцыянальна адпрацаванаму часу ці прадастаўляць ім адпачынак (неаплочваемы) тэрмінам да 3 месяцаў.

Пры спыненні фінансавання па выконваемай гэтым супрацоўнікам навукова-даследчай рабоце, выплочваць заработную плату ў памеры мінімальнай заработнай платы да моманту звальнення па скарачэнні штатнай колькасці.

Адк.: навукова-даследчая частка, галоўны бухгалтар.

РАЗДЗЕЛ ІV. ПАДРЫХТОЎКА КАДРАЎ І ПАВЫШЭННЕ КВАЛІФІКАЦЫІ

4.1. Забяспечыць умовы для павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў усіх формаў навучання згодна з планамі факультэтаў.

4.2. Пашыраць навукова-тэхнічную інфармаванасць прафесарска-выкладчыцкага саставу і студэнтаў універсітэта аб найноўшых дасягненнях навукі і тэхнікі шляхам арганізацыі выстаў у бібліятэцы.

Адк.: дырэктар бібліятэкі, аддзел навукова-тэхнічнай інфармацыі.

4.3. Садзейнічаць выхаду ў свет заказных манаграфій супрацоўнікаў універсітэта, якія працуюць над доктарскімі дысертацыямі.

Адк.: рэктарат.

4.4. Камандзіроўкі ў замежныя ВНУ і фірмы (навуковая праца, стажыроўка, вучоба) афармляць толькі на аснове рэкамендацый вучоных саветаў факультэтаў; у выпадку асаблівай тэрміновасці — па рэкамендацыі дэканаў з наступным зацвярджэннем на вучоных саветах.

Адк.: дэканы факультэтаў, начальнік упраўлення замежных сувязей.

РАЗДЗЕЛ V. ВЫТВОРЧАЯ І ПРАЦОЎНАЯ ДЫСЦЫПЛІНА

5.1. Супрацоўнікі і студэнты універсітэта абавязуюцца захоўваць вытворчую і працоўную дысцыпліну, палажэнні правілаў унутранага працоўнага распарадку і добрасумленна выконваць свае функцыянальныя абавязкі.

Адк.: кіраўнікі структурных падраздзяленняў, прафбюро.

5.2. Да 1.01.94 распрацаваць і выдаць вытворчы каляндар універсітэта на 1994 год.

Адк.: рэктарат.

5.3. Для прафесарска-выкладчыцкага саставу ўсталёўваецца шасцігадзінны працоўны дзень, у межах якога выкладчыкі павінны выконваць усе віды вучэбна-метадычнай і навукова-даследчай работы.

Адк.: дэканы факультэтаў.

5.4. Для супрацоўнікаў, якія непасрэдна не ўдзельнічаюць у вучэбным працэсе, усталёўваецца пяцідзённы працоўны тыдзень. Пачатак і заканчэнне работы ўсталёўваецца з 8.30 да 17.30 гадзін, а ў перадсвяточныя дні з 8.30 да 16.30.

Адк.: начальнік аддзела кадраў.

5.5. Своечасова даводзіць да ведама членаў калектыву нарматыўныя акты, якія рэгулююць пытанні аплаты працы, працоўных адносін, аховы працы ў ВНУ.

Адк.: аддзел кадраў, агульна-прававы, аховы працы і тэхнікі бяспекі.

5.6. Разглядаць скаргі і канфліктныя сітуацыі і прымаць па іх рашэнні ва ўстаноўлены тэрмін.

Адк.: прафкам.

5.7. Забяспечыць галоснасць і нагляднасць аб мерах заахвочвання за добрасумленную працу і дысцыплінарнага ўздзеяння да парушальнікаў працоўнай дысцыпліны, грамадскага парадку.

Адк.: аддзел кадраў.

РАЗДЗЕЛ VІ. АХОВА ПРАЦЫ

Адміністрацыя абавязуецца:

6.1. Своечасова праводзіць усе віды інструктажаў па ахове працы і супрацьпажарнай прафілактыцы, рэгулярна праводзіць навучанне і праверку ведаў тэхнікі бяспекі супрацоўнікамі, занятымі на работах з павышанай небяспекай.

Своечасова забяспечваць супрацоўнікаў універсітэта спецадзеннем, спецабуткам і сродкамі індывідуальнай аховы ў адпаведнасці з дзеючымі нарматывамі.

Адк.: аддзел аховы працы і тэхнікі бяспекі.

6.2. Забяспечыць супрацоўнікам, якія працуюць у шкодных умовах, наступныя ільготы:

— бясплатную выдачу малака — 620 чалавек;

— даплаты да зарплаты — 138 чалавек;

— дадатковы адпачынак — 88 чалавек;

— скарочаны рабочы дзень — 131 чалавек.

(на адну гадзіну).

Адк.: аддзел аховы працы і тэхнікі бяспекі, агульна-прававы аддзел, прафкам.

6.3. Перыядычна праводзіць аналіз паветранага асяроддзя ў памяшканнях універсітэта, даваць ацэнку эфектыўнасці работы вентыляцыйных установак, праводзіць замеры ізаляцыі, асвятляльнасці рабочых месцаў, тэмпературнага рэжыму у лабараторыях, аўдыторыях і іншых памяшканнях.

Адк.: аддзел аховы працы і тэхнікі бяспекі, лабараторыя службы радыяцыйнай бяспекі.

6.4. Скараціць да мінімуму колькасць вячэрніх заняткаў для выкладчыкаў-жанчын, якія маюць дзяцей школьнага ўзросту, выключыць адпаведныя заняткі для жанчын, якія маюць дзяцей дашкольнага ўзросту.

Адк.: загадчыкі кафедрамі, прафбюро факультэтаў.

РАЗДЗЕЛ VІІ. ЖЫЛЛЁВА-БЫТАВЫЯ ЎМОВЫ

7.1. Прадастаўленне жылой плошчы ажыццяўляць у адпаведнасці са спісам чаргі на атрыманне жылля з улікам абумоўленых законам ільгот. Складзі ільготны спіс супрацоўнікаў.

7.2. Пры паляпшэнні жыллёвых умоў даволіць выдаленне жылля супрацоўнікам універсітэта, якія маюць да 8 квадратных метраў на адна-го члена сям'і.

Адк.: прафкам.

7.3. Супрацоўнік, які аднойчы ўжо атрымаў кватэру ад універсітэта, можа разглядацца паўторна на паляпшэнне жыллёвых умоў толькі ў выпадку перадачы займаемай кватэры універсітэту для паўторнага засялення.

Адк.: рэктарат, прафкам.

РАЗДЗЕЛ VІІІ. САЦЫЯЛЬНАЕ СТРАХАВАННЕ І ГРАМАДСКАЕ ХАРЧАВАННЕ

8.1. На падставе арт. 5 КЗаП РБ устанавіць для ўсіх катэгорый супрацоўнікаў універсітэта мінімальны чарговы адпачынак — 18 дзён.

Адк.: рэктарат.

8.2. Па дамоўленасці бакоў адміністрацыя можа прадастаўляць супрацоўнікам адпачынак без захавання заработнай платы, ці з наступнай адпрацоўкай, па сямейных ці іншых абставінах ад 3 да 30 каляндарных дзён.

Адк.: рэктарат.

8.3. Забяспечыць бесперапынную работу ўсіх кропак грамадскага харчавання (сталовыя, буфеты, кафэ) універсітэта. Дабівацца паляпшэння якаснага прыгатавання страў.

Адк.: рэктарат.

8.4. Ажыццяўляць рэгулярны кантроль за работай сталовых, буфетаў і кафэ ў мэтах паляпшэння санітарна-гігіенічных умоў і якасці прыгатавання ежы.

Адк.: прафкам.

8.5. Забяспечыць бесперапынную работу стала заказаў для выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.

Адк.: прафкам.

8.6. Забяспечыць супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта ільготнымі пуцёўкамі ў санаторыі, дамы адпачынку, пансіянаты, на дыетхарчаванне. Сумесна з рэктаратам набываць дадатковыя пуцёўкі на лячэнне і адпачынак за кошт фонду сацыяльнага развіцця універсітэта.

Адк.: прафкам.

8.7. Забяспечыць правя-

КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР ПРАФСАЮЗНАГА КАМІТЭТА І АДМІНІСТРАЦЫІ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА НА 1993 ГОД.

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.).

дзенне адпачынку выкладчыкаў і супрацоўнікаў і канікулаў студэнтаў шляхам прадастаўлення пуцёвак на:

— санаторна-курортнае лячэнне;

— адпачынак па пуцёўках міжнароднага турызму;

— адпачынак дзяцей супрацоўнікаў у дзіцячых піянерскіх лагерах.

Адк.: прафкам.

РАЗДЗЕЛ IX. КУЛЬТУРНА-ВЫХАВАЎЧАЯ, СПАРТЫЎНА-МАСАВАЯ І МЕДЫКА-АЗДАРАЎЛЕНЧАЯ РАБОТА

9.1. Забяспечыць фінансаванне груп здароўя ў адпаведнасці з каштарысам работы прафкама.

Адк.: прафкам.

9.2. Аказваць падраздзяленням дапамогу ў арганізацыі экскурсійных паездак па гістарычных і культурных мясцінах, асабліва ў час адпачынку.

Адк.: прафкам.

9.3. Арганізаваць цэнтралізаванае забеспячэнне білетамі на канцэрты, у кіно і тэатры.

Адк.: прафкам.

9.4. Праводзіць урачыстыя вечарыны, прысвечаныя знамянальным датам, тэматычныя вечарыны, творчыя справаздачы народных калектываў, выставы народнай творчасці.

Адк.: рэктарат, прафкам.

9.5. Удасканальваць сістэму аздараўлення супрацоўнікаў універсітэта. Наладзіць улік чаргі тых, хто мае патрэбу ў лячэнні і кантролі за якасцю лячэння.

Адк.: прафкам.

9.6. Арганізаваць на базе паліклінічнага аддзялення ўніверсітэта і прафілакторыя медыцынскі агляд супрацоўнікаў па жаданню.

Адк.: прафкам.

9.7. З улікам экалагічнай абстаноўкі і ў мэтах своечасовага выяўлення захворванняў на працягу 1993 года правесці медыцынскую дыягностыку ўсіх супрацоўнікаў універсітэта.

Адк.: прафкам.

НУ І НУ!

КАМП'ЮТЭР — НЕБЯСПЕЧНАЯ ЗАБАВА

Камп'ютэры заваёўваюць свет. Усё больш уладарна пранікаюць яны ў жыццё чалавека, становячыся незаменнымі яго памочнікамі.

Разам з дарослымі цягнуцца да яркіх экранаў і дзеці. Закінуты ў далёкі вугал машынкі і лялькі, пакрыліся пылам футбольныя мячы і скакалкі, няма калі ўспамінаць пра «дочкі-маці» і «казакоў-рабаўнікоў». Забавы дзяцінства заменены прывабнымі камп'ютэрнымі гульнямі.

Але ці такая ўжо бясшкодная новая забаўка? Камп'ютэрныя гульні развіваюць назіральнасць, хуткасць рэакцыі і мысленне дзіцяці. Але не так усё бясхмарна ў адносінах: дзіця—камп'ютэр. Па дадзеных Нацыянальнай акадэміі навук ЗША, а таксама па выніках шматлікіх даследванняў, што праведзены вучонымі Аўстраліі, Германіі і шэрагу міжнародных цэнтраў, выяўлена вызначаная сувязь паміж працай за камп'ютэрам і такімі недамаганнямі, як астэнопія (хуткая стамляльнасць вачэй), болі ў спіне і шыі, тэндэніты (запаленчыя працэсы ў тканках сухажылляў), стэнакардыя і розныя стрэсавыя настроі, сып на твары, хранічныя галаўныя болі, павышаная ўзбуджальнасць і дэпрэсіўны стан, зніжэнне канцэнтрацыі ўвагі, парушэнне сну и, на жаль, шмат іншых, якія згубна адбіваюцца на здароўі дарослых людзей, не гаворачы ўжо пра дзіцячы арганізм.

Крыніцай найбольш шкодных выпраменьванняў, якія нядобра ўплываюць на здароўе людзей, што працуюць за камп'ютэрамі, з'яўляюцца дысплеі (маніторы), асабліва з электронна-прамянёвымі трубкамі.

Як адзначыў канадскі біяфізік К. Мара, «няма ніводнага пытання настолькі важнага, хвалюючага і складанага, як пытанне электрамагнітнага выпраменьвання дысплея». Гісторыя даследвання гэтага пытання дастаткова працяглая і няпростая, але атрыманыя вынікі носяць пакуль пераважна статыстычны характар і не маюць адэкватнага тлумачэння.

Небяспека рэнтгенаўскіх і часткі іншых выпраменьванняў большасцю вучоных лічыцца вельмі малой, паколькі іх узровень дастаткова невялікі і ў асноўным паглынаецца пакрыццём экрана.

Найбольш цяжкая сітуацыя складваецца з палямі выпраменьванняў вельмі нізкіх частот, якія, як высвятлілася, здольныя выклікаць біялагічныя эфекты пад час уздзеяння на жывыя арганізмы. Асабліва дзіўным для даследчыкаў быў той факт, што ў адрозненне, напрыклад, ад рэнтгенаўскага выпраменьвання, электрамагнітныя хвалі валодаюць незвычайнай якасцю: небяспека іх уздзеяння пры зніжэнні інтэнсіўнасці выпраменьвання не змяншаецца. Мала таго, некаторыя з палёў уздзейнічаюць на клеткі арганізма толькі пры малых інтэнсіўнасцях ці на канкрэтных частотах. Згодна аднаму з тлумачэнняў, сфармуліраванаму амерыканскімі вучонымі, пераменнае электрамагнітнае поле, якое здзяйсняе ваганні з частатой каля 60 Гц, уцягвае ў аналагічныя ваганні малекулы любога тыпу, незалежна ад таго, знаходзяцца яны ў мазгу чалавека ці ў яго целе. Вынікам гэтага з'яўляецца перамена актыўнасці ферментаў і клеткавага імунітэту, прычым падобныя працэсы назіраюцца ў арганізме і пад час уздзеяння пухлін. «Можна і не быць медыкам,— заўважае амерыканскі ўрач П. Броўдэр,— для таго, каб зразумець, што падобныя электрамагнітныя з'явы, якія не маюць аналагаў у гісторыі эвалюцыі чалавека, могуць аказваць шкоднае ўздзеянне на арганізм». Спецыяльныя вымярэнні паказалі, што маніторы сапраўды выпраменьваюць магнітныя хвалі, якія па інтэнсіўнасці не уступаюць узроўням магнітных палёў, што здольныя абумоўліваць з'яўленне пухлін у людзей.

Пры даследваннях, звязаных з вывучаннем вокавых захворванняў, быў таксама атрыманы несуцяшальны вынік. Высвятлілася, што людзі, якія праседжваюць за дысплеем камп'ютэра па 7 і болей гадзін у дзень пакутуюць на запаленні і іншыя захворванні вачэй на 70 працэнтаў часцей за тых, хто «забаўляецца» з камп'ютэрам менш часу.

Скуравыя захворванні (твару) звязаны ў асноўным з тым, што наэлектрызаваны экран дысплея прыцягвае часціцы ўзважанага ў паветры пылу, так што паблізу яго «якасць» паветра пагаршаецца, і чалавек вымушаны працаваць у больш запыленай атмасферы. Такім паветрам ён, дарэчы, і дыхае.

Так што, заўважыўшы, як ваш сын увесь дзень прасядзеў за камп'ютэрам, успомніце пра гэтыя насцярожваючыя факты сусветнай статыстыкі.

А мне, напрыклад, вельмі хацелася б, каб мая дачка, націскаючы пальчыкамі клавішы бацькавага камп'ютэра, сэрцам жыла ў чароўным свеце казак, а ўвечары спакойна засынала, прыціскаючы да сябе любімага плюшавага мішку.

Святлана КЛІМУК,
выпускніца БДУ.

НАМ ПАТРЭБЕН МІР

Днямі Мінск наведалі ўдзельнікі «Прабегу міра-93», які ўзяў старт 17 красавіка ля штаб-кватэры ААН у Нью-Йорку. За гэты час паходню — сімвал міру і еднасці людзей у барацьбе за яго — пранеслі тысячы бегуноў у 80 краінах свету. У Мінск чарговы этап прыбыў з Кіева, напярэдзе ў пасланцоў міру — новыя гарады, краіны, сустрэчы. Мінчане віталі ўдзельнікаў прабегу на сталічнай плошчы Перамогі, у парку імя Горкага, дзе была наладжана ўрачыстая сустрэча і вялікі канцэрт.

Фота С. ВАСІЛЬЕВА.

З ЮБІЛЕЕМ!

ДА ВЯРШЫНЬ НАВУКІ

Годы бяруць сваё: апошнім часам Фёдар Іванавіч Куляшоў часта хварэе. Але ад прапанаванай сустрэчы не адмовіўся, прызначыў час і па-гаспадарску паказваў пакоі, у якіх пражыў доўгі час і стварыў не адну навуковую працу.

Асабістая бібліятэка прафесара Куляшова налічвае звыш 12 тысяч тамоў самай разнастайнай літаратуры: айчынная і замежная класіка, філасофская і навуковая літаратура. Знайшлі прытулак у гэтым пакоі і шматлікія сямейныя фотаздымкі. Вось напаўжаўцелы здымак Фёдара Іванавіча з жонкай Вольгай Піліпаўнай — швагеркай вядомага рускага пісьменніка А. Купрына. Гэта сваяцтва адыграла ў жыцці Фёдара Іванавіча вялікую ролю: спачатку ён палюбіў Купрына-пісьменніка, потым пачаў даследваць яго творчасць і, нарэшце, напісаў манаграфію пра жыццёвы і творчы шлях Купрына, аналагаў якой у свеце пакуль няма.

А гэта — Куляшовы з Васілём Быкавым. Дарэчы, Фёдар Іванавіч добра знаёмы з многімі вядомымі літаратарамі. Асабліва хочацца прыгадаць яго сяброўства з І. Мележам. Ён першым заўважыў у Івана Паўлавіча задаткі сапраўднага майстра слова. А кніга «Іван Мележ. Літаратурная біяграфія» дагэтуль застаецца лепшым творчым партрэтам Івана Мележа.

Фотаздымкі... Нямое сведчанне аб адным толькі імгненні, а як многа гавораць яны пра свайго гаспадара.

Тым часам Фёдар Іванавіч дастаў з паліцы кнігу Верасаева:

— 28 красавіка 1938 года мяне арыштавалі. Непасрэднай падставай для арышту было захаванне забароненых кніг Верасаева, Ясенскага і іншых. Праўда, судзіць збіраліся не за гэта. Першапачаткова абвінавацілі ў здрадзе Радзіме, тэрарыстычнай дзейнасці. Але за 13 месяцаў, якія я правёў ва ўнутранай турме НКУС, ад мяне не дамагліся «патрэбных» паказанняў. Таму судзілі за групавую контррэвалюцыйную агітацыю і недонясенне. Тэрмін знаходжання ў выпраўленча-працоўных лагерах вызначылі ў пяць год. Адбываў яго на будаўніцтве чыгункі Масква-Варкута. Калі ў 1943 годзе вызваліўся, да Варкуты заставалася 20 кіламетраў. І хто ведае, ці дайшоў бы я да гэтага горада, калі б мяне яшчэ на нейкі час затрымалі. З 700 зняволеных жывымі выйшлі з гэтага пекла толькі 46. Толькі тры гады назад да мяне прыйшла рэабілітацыя.

....Вясной 1944 года Ф. І. Куляшоў здае дзяржаўныя экзамены ў Ленінградскі пед-інстытут імя Герцена. За чатыры гады працы ў Кустанайскім настаўніцкім інстытуце ён экстэрнам здае кандыдацкі мінімум і самастойна, без навуковага кіраўніка, піша кандыдацкую дысертацыю, якую потым паспяхова абараняе ў Ленінградзе. 1951 год знамянальны ў жыцці будучага прафесара, на той час дацэнта — нарэшце, ён вяртаецца на радзіму, становіцца дацэнтам кафедры рускай літаратуры Белдзяржуніверсітэта. Пачынаецца плённая праца ў галіне выкладання літаратуры і літаратурнакрытычнай дзейнасці.

Здавалася б, нарэшце, у жыцці ўсё наладзілася, але нечакана для ўсіх у 1955 годзе, Фёдар Іванавіч едзе на Сахалін працаваць у мясцовым педагагічным інстытуце. А вярнуўшыся ў 1961 годзе ў родны ўніверсітэт, праз тры гады абараняе доктарскую дысертацыю, атрымлівае званне прафесара. І да 1990 года паспяхова выкладае на філфаку рускую літаратуру.

...Фёдар Іванавіч дастае з паліцы стары тоўсты сшытак, на вокладцы якога пазначана: «Дзённік, 1937 г.» На працягу больш як пяцідзесяці год Ф. І. Куляшоў вядзе асабістыя запісы думак, падзей, што адбываюцца ў жыцці. Па сённяшні дзень не кідае ён гэтую справу.

Зараз Фёдар Іванавіч працуе над новымі выданнямі. У самы бліжэйшы час павінна выйсці кніга малавядомых твораў Купрына, складаў якую Куляшоў. Нягледзячы на васьмідзесяцігадовы ўзрост Фёдар Іванавіч шмат працуе і сёння...

А. ЮРЫН.

СЛУЖБА 03

СЦЕРАЖЫСЯ ТУБЕРКУЛЁЗУ!

Сёння ў краіне на туберкулёз хварэе больш за паўмільёна чалавек. Штогод выяўляецца да 150 тысяч так званых хворых з упершыню ўстаноўленым дыягназам актыўнага туберкулёзу. Смяротнасць ад гэтай хваробы вышэйшая, чым ад усіх іншых 37 інфекцыйных захворванняў разам узятых. Выклікаецца захворванне палачкай Кока, якая вельмі ўстойлівая да ўздзеяння неспрыяльных фактараў навакольнага асяроддзя. Крыніцай распаўсюджвання інфекцыі з'яўляецца хворы чалавек, які пры кашлі і чханні выдзяляе дробныя кропелькі макраты і сліны. Яны рассейваюцца на 0,5—1,5 см і трымаюцца ў паветры 30—60 хвілін.

На туберкулёз хварэюць людзі рознага ўзросту і полу. Пры гэтым захворванні пашкоджваюцца не толькі лёгкія, але і іншыя органы: вочы, скура, ныркі, лімфатычная і нервовая сістэмы. Захворванне пачынаецца з павышэння тэмпературы цела, патлівасці па начах. Пагаршаецца сон і апетыт. Рашаючая роля ў распазнаванні пачатковых формаў туберкулёзу лёгкіх належыць рэнтгенаўскаму метаду абследвання. Гэтым шляхам магчыма знайсці хваробу ў тых выпадках, калі яна не праяўляецца знешне ці працякае як грып ці бранхіт.

Флюараграфія — метад ранняга выяўлення туберкулёзу. Апраменьванне пры флюараграфічным абследванні не аказвае шкоднага ўздзеяння на арганізм. Выяўленне ж захворвання ў самым пачатку пры лячэнні прыводзіць да выздараўлення.

ПАМЯТАЙЦЕ*

Рызыка захварэць на туберкулёз найбольшая ў тых, хто пакутуе на:

— цукровы дыябет;

— язву страўніка і 12-перснай кішкі;

— псіхічныя звхворванні;

—— хранічныя неспецыфічныя захворванні органаў дыхання;

— алкагалізм і наркаманію;

Яна высокая таксама ў тых, хто даўно не праходзіў прафілактычны агляд, хто мае астаткавыя змяненні пасля перанесенага туберкулёзу, хто прымае гарманальныя прэпараты.

Заг. пульманалагічным аддзяленнем 2-ой гарадской клінічнай бальніцы.

А. АЛЕЙНІКАЎ.

МАСТАЦКАЯ ГАСЦІНАЯ

Выпуск падрыхтаваны студэнтамі IV курса факультэта журналістыкі (Навуковы кіраўнік І. АЎДЗЕЕЎ).

ПАМЯЦЬ АБ МІНУЛЫМ

Стэфанія Міхайлаўна Станюта пачынала іграць у Першым беларускім таварыстве драмы і камедыі, які праз некалькі год быў перайменаваны ў Першы беларускі дзяржаўны тэатр. Гэта быў пачатак стагоддзя, дваццатыя гады.

Размова са Стэфаніяй Міхайлаўнай, здаецца, дапамагла ўзнавіць напаўзабытыя часы яе маладосці, своеасаблівы водар эпохі. Менавіта аднаўленне мінулага праз дэталь, праз памяць стала лейтматывам гэтага інтэрв'ю.

— Стэфанія Міхайлаўна, калі адбылася рэвалюцыя 1917-га, вам было не больш дванаццаці гадоў...

— Я вучылася, здаецца, у чацвёртым класе гімназіі... І так нам усім было прыемна, што нашай класнай дамы няма, што мы вольныя!... А то ж трэба было малітвы чытаць перад заняткамі. (Яна ўсміхаецца.). Калісьці я хадзіла ў царкву, спявала ў царкоўным хоры. Мы тады жылі на Чырвонай вуліцы, і там была маленькая вайсковая цэркаўка. Я вельмі любіла спяваць і танцаваць.

— Чым запомніўся Вам самы пачатак работы ў тэатры?

— Мяне прывяла ў Беларускае таварыства драмы і камедыі сяброўка, акторка. Мне было чатырнаццаць ці пятнаццаць год, я была высокая і ніколі не казала, колькі мне сапраўды, а дадавала, каб было больш, чым на самай справе. Калі я пачынала працаваць, гэта быў аматарскі тэатр. Мы ездзілі на раён, у нейкія вёскі, ішлі пехам, а на калымажцы ехалі нашы рэчы і інструменты аркестра. У самым пачатку дваццатых гадоў нас, «маладых і таленавітых», як тады казалі, актораў ужо Першага беларускага дзяржаўнага тэатра вырашылі адправіць у Маскву вучыцца каб на Беларусі з'явіўся свой прафесійны тэатр. І я, адзіная дачка ў бацькоў, паехала. (Ёй тады было шаснаццаць год.). Як гэта хапіла ў мяне адвагі, не ведаю, бо нікуды далей Докшыц з бацькамі не выязджала. Пяць год мы вучыліся ў Маскве.

— Вас турбавалі матэрыяльныя праблемы? Здаецца, гэта былі галодныя гады.

— Што вы! (Стэфанія Міхайлаўна ўсплесквае рукамі). Толькі семечкі нас ратавалі. Урад дасылаў нам падмарожаную бульбу, нейкую саланіну, цукеркі і тытунь для хлопцаў. Вось такі паёк. Дасланую нам муку мы адразу абменьвалі на боханы напалову спечанага хлеба. Хлеб і сахарын былі нашым сняданкам і вячэрай. А ўжо ў абед гатавалі бульбу, заскварвалі булён. Але які ў ім быў тлушч — трэба было прыгледзецца...

— Вы заспелі Маскву ў часы бласлаўленыя для мастацтва. Чым захапляла вас культурнае жыццё таго часу?

— Маскву тады называлі тэатральнай Мекай. Гэта была цэлая эпоха. Якіх толькі тэатраў і накірункаў тады не было! Працавалі раманэск, рамантычны тэатр, студыя Вахтангава, першая, другая, трэцяя, чацвёртая, пятая студыі. Мы бывалі ў тэатры Граноўскага, у Яўрэйскім тэатры, сябравалі з акторамі. Усё было палітычным, новым. Калі Эйзенштэйн ставіў «Мексіканцаў» у Пралеткульце, дык там былі толькі палітычныя маскі. Ад п'ес Астроўскага «На ўсялякага мудраца хопіць прастаты» пакінулі толькі схему інтрыг. Актор Аляксандраў, які іграў Глумава, хадзіў па драціне над залай, і мы на яго глядзелі вось так... — Стэфанія Міхайлаўна пільна ўглядаецца ў стол.

Па-мойму, мы былі на ўсіх спектаклях Мейерхольда. Аднак любімым быў тэатр Таірава. Там грала АЛІСА КОНЕН. Ах, якія ў яе былі рухі, якая пластыка, голас, якая музыка самога маўлення...

— Які від мастацтва Вас захапляе гэтак жа, як тэатр?

— Балет. Асабліва сучасны, раскаваны, не класічны. У свой час, калі я вучылася ў Маскве, нам для фізічнага развіцця выкладалі пластыку, рытміку, акрабатыку і біямеханіку. Наш педагог, дзякуючы ўплыву Айседоры Дункан, вучыў нас натуральнасці рухаў. Трэба было валодаць сваім целам гэтак жа, як валодаеш эмоцыямі і голасам.

— Стэфанія Міхайлаўна, вы не аднойчы іралі простую беларускую жанчыну. У вас быў перад вачыма пра татып гэтага вобраза, жывы, рэальны чалавек?

— А як жа. Мама была. Вы ведаеце, ніхто не сказаў бы, што яна непісьменная. У яе быў нейкі прыродны такт, прыродная высакароднасць, дабрыня — такая непаказальная, нібы інакш і быць не магло. Бывае пакладзе мама страву ў кошык і дасылае мяне да днявальнага, які вартаваў вясковую царкву, бо ён, бедны, не вячэраў.

— Стэфанія Міхайлаўна, Вы б назвалі сваё жыццё цяжкім?

— Цяжка было вучыцца, а работа на сцэне дапамагае забыцца на ўласныя цяжкасці. Іншы раз мяне пытаюцца, чаму я згаджаюся на маленькія ролі. Чаму? Я нібы хварэю, калі не працую. Я думаю, самае галоўнае — гэта адчуванне, што твая работа некаму патрэбна.

Гутарыла Наталля ЖУК.

«Я ЛЮБЛЮ РЭПЕТЫЦЫІ»

— Як Вы адчувалі сябе, калі прыйшлі ў тэатр?

— Тады, у пяцідзесятыя гады, у Купалаўскі на працу ўзялі вялікую групу выхаванцаў тэатральна-мастацкага. Разам са мною прыйшлі і Тарасаў, і Аўсяннікаў, і Таўкачова. У творчых адносінах для нас пачалося проста райскае жыццё. Я адразу атрымала галоўную ролю ў п'есе Івана Мележа «Пакуль вы маладыя».

— А як складваліся адносіны «маладога папаўнення» са старэйшымі акцёрамі трупы?

— Яны былі вельмі добразычлівымі. Здаралася, сядзім на рэпетыцыі, маладыя, і таму вечна галодныя, тут цішком падыдуць да нас Бірыла або Ржэцкая і прапануюць шакаладку або булачку з макам. Зусім па-мацярынску ставілася да мяне Лідзія Ржэцкая. Глядзела мае рэпетыцыі, рабіла слушныя заўвагі. Я заўсёды адчувала сябе побач з ёю больш упэўнена. Сённяшнія маладыя акцёры адрозніваюцца ад нас большай самастойнасцю, гатоўнасцю ўзваліць усе цяжкасці на свае плечы. Мы былі не такімі...

— Праца над якімі ролямі прыносіла Вам найвялікшае творчае задавальненне?

— Па-першае, творчы працэс не заўсёды ідзе так роўна, як марыцца. Прымаючы ружы ад гледачоў, не трэба забывацца на калючкі. Па-другое, я не падзяляю свае ролі на тыя, што спадабаліся, і тыя, што не спадабаліся. Падзел трошкі іншы — болей або менеі значныя для мяне. Быў у маім жыцці перыяд, калі я іграла нецікавых, аднатыпных гераінь. Потым — зрух: роля Лізы Хрэнавай у спектаклі Барыса **ЛУЦЭНКІ** па п'есе Розава «Традыцыйны збор». Роля вострахарактарная, глыбінная — непрыгожая разумная дзяўчына, якая па-свойму марыць пра шчасце, і жадае «купіць» каханага. Тады я была прывабнай актрысай, і для гэтай ролі спецыяльна грыміравалася, клеіла сабе вяснушкі. Да значных роляў адношу і Ганну ў «Людзях на балоце», і Зосю ў «Сэрцы на далоні» Шамякіна, Марыю ў «Святая святых» Друцэ, Варвару ў спектаклі Хейфіца «Навальніца», Ганну ў «Плачы перапёлкі» Чыгрынава. Але, якая б роля не выпадала, заўсёды хочацца напоўніць яе сапраўднымі пачуццямі. І калі з'яўляецца адчуванне таго, што твая гераіня перажывае ўсе падзеі па-сапраўднаму, то на рэпетыцыю іду, як на свята.

— Што можаце сказаць аб тых гадах, калі выконвалі абавязкі парторга тэатра?

— Я займала гэтую пасаду толькі два гады. Іх можна назваць «папяровымі». Але людзі ў тэатры працавалі і разважалі зусім на іншым узроўні, таму партячэйкі ў традыцыйным разуменні ў нас не было.

— Вы не задумваліся, што ў рэпертуары тэатра няма ролі, якую Вы па-сапраўднаму заслугоўваеце?

— Лепей будзе вызначыць іншую якасць — любы акцёр можа шкадаваць, што яго рэдка задзейнічаюць у класічных творах. У Купалаўскага быў перыяд, калі класікі проста не хапала ў рэпертуары, вельмі шмат ўвагі надавалася водгукам на актуальныя падзеі. Затым становішча выправілася. Праблема кожнага тэатра ў тым і заключаецца, каб знайсці адпаведнасць паміж сучасным і класічным, паміж тым, чым цікавіцца трупа, і тым, чым цікавіцца глядач.

— За той час, што вы працуеце ў тэатры, якая характэрная рыса творчага калектыва Купалаўскага засталася нязменнай?

— Вялікая самаадданасць людзей тэатру. Сувязь пакаленняў акцёраў купалаўцаў ніколі не рвалася, у трупе працуе не адна акцёрская дынастыя, а разам з гэтым захоўваюцца лепшыя традыцыі майстэрства.

Ягор КОНЕЎ.

А, можа, гэта толькі агульны стэрыятып, і жанчыны не маюць такога ўжо шчыльнага дачынення да тэатра? Бо тэатр — гэта не толькі кветкі і любоў гледачоў, але і цяжкая праца. Безумоўна, усе жанчыны — добрыя акторкі ў жыцці. Але сваё звычайнае жыццё і чужое жыццё на сцэне — гэта розныя рэчы. І веданне чалавечых слабасцей и памылак, на жаль, не дае актрысе магчымасці пазбегнуць іх і лягчэй пражыць сваё жыццё. А яшчэ на плечы ўскладзены абавязак, а не проста жаданне, заўсёды быць прывабнай і абаяльнай. Хіба здольна вытрымаць усё гэта звычайная жанчына? Звычайная, сапраўды, не. Але жанчынам-акторкам і гэтых клопатаў чамусьці недастаткова.

Яна ведае, як не старэць

Зінаіда Іванаўна Браварская нарадзілася ў Адэсе. Яшчэ школьніцай удзельнічала ў агітбрыгадзе. Калі ў восьмым класе праводзілі тэст на выбар прафесіі, то ў першы раз дзяўчыне выпала быць архітэктарам, а ў другі — пажарнікам. Таму будучая актрыса запісалася ў пажарную дружыну і прайшла пажарнікам вытворчую практыку. Але цяга да мастацтва ўсё ж выявілася. Скончыўшы Адэскі музычна-драматычны тэхнікум, Зінаіда Браварская едзе ў Маскву і паступае ў дзяржаўны інстытут імя Луначарскага. Варта адзначыць, што прыёмную камісію ў інстытуце ўзначальваў Баталаў, а пасля паступлення вучылася Зінаіда Іванаўна па класу такіх вядомых рускіх актораў, як Тарханаў, і Плотнікаў.

Шмат займалася спортам: акрабатыкай, верхавой яздой, плаваннем, фехтаваннем. У 1937 годзе Зінаіда Іванаўна скончыла інстытут і прыехала ў Мінск. Пачынала працаваць у Тэатры юнага гледача, праз год перайшла ў Першы беларускі, да купалаўцаў. У вайну яна працавала ў Маскоўскім франтавым тэатры, якім кіраваў рэжысёр МХАТа І. М. Раеўскі, у тэатрах Пензы, Ашхабада, Куйбышава. З 1950 пачала працаваць у тэатры імя Я. Купалы.

За 55 гадоў працы на сцэне актрыса сыграла сотні роляў. Але Зінаіда Іванаўна не любіць, калі пытаюцца, якія з іх любімыя. «Ды хіба можна так ставіць пытанне? — гаворыць яна.— Акцёру дарагія ўсе ролі, над якімі ён працуе. І гэта не фраза, а чыстая праўда. Потым некаторыя з іх прызнаюць удачамі, а некаторыя — і самому няёмка ўспамінаць. Але пакуль працуеш над роляй — улюбляешся ў кожную. Разумеце, у кожную».

Адны гавораць пра Браварскую як атрысу, якая нягледзячы на разнастайнасць сыграных роляў, знайшла сваю тэму — тэму таленавітай жанчыны са складаным. лёсам. Другія пішуць, што акцёрская тэма Браварскай — гэта тэма чалавечай дабрыні, міласэрнасці і шчасця. Але дадаюць: «Шчасця, з якім не згаджаецца жыццё». Бо кожная роля Браварскай будуецца на канфлікце мары, каханя і рэальнага свету. Сама ж Зінаіда Іванаўна неяк сказала: «Мне заўсёды хацелася іграць гераінь, якія гатовы кожнага адарыць багаццем сваёй душы. На жаль, не так часта мы сустракаем іх у п'есах. Але вось, напрыклад, Эржэбет у «Гульні з кошкай» Іштвана Эркеня блізкая мне сваім светаадчуваннем. Некаторым здаецца, што гэта п'еса пра адзінокую старасць. Не, яна аб месцы чалавека ў жыцці.

Ён адзінокі, калі не можа аддаваць сябе людзям, калі ён ім не патрэбен. Эржэбет умее жыць для іншых. Яна не зрабілася жорсткай, не ачарствела ў сваёй адзіноце, не адвярнулася ад жыцця. Ёй прыносяць радасць кветка, птушка, сонечны дзень. І ў гэтай радасці яе багацце.

Па прызнанню Зінаіды Іванаўны філасофіі сваёй гераіні яна прытрымліваецца ўсё жыццё: «Чым больш ад сэрца адрываеш, тым больш ля сэрца застаецца». А яе Эржы засталася ў памяці гледачоў і крытыкаў адной з самых цудоўных работ на сцэне Купалаўскага тэатра.

«Так, мастацтва павінна вучыць складанай навуцы,— лічыць актрыса,— уменню спачуваць, яно павінна развіваць слых душы і ачышчаць душы, узрушваць, прымушаць людзей задумацца». Разам з тым Зінаіда Іванаўна пераканана, што мастацтва можа ўспрымаць падрыхтаваны чалавек.

Зінаіда Іванаўна паставіла п'есы «Я так хачу» (Р. Раманаў), «Яны любілі яго» (Я. Кертас), «Матылёк, матылёк...» (А. Нікалаі). У 1956 годзе разам з Эрыным і Уладамірскім стала рэжысёрам спектакля «Людзі на балоце». Да таго ж, Зінаіда Іванаўна — аўтар і рэжысёр многіх інсцэніровак на радыё і тэлебачанні. Наогул, пра Зінаіду Іванаўну гавораць, што з ёй не вельмі лёгка бывае працаваць і партнёрам, і рэжысёрам, што яна заўсёды любіць спрачацца, заўсёды ў яе асабісты погляд на ролю, на выбар п'есы і гэты свой погляд яна ўпарта адстойвае.

У артыкуле, прысвечаным Зінаідзе Браварскай, адзін з журналістаў пісаў аб старэйшым пакаленні акцёраў: «А яшчэ яны ведаюць, як не старэць. У іх незвычайная энергетыка. Яны, здаецца, падпітваюцца энергіяй тады ж, калі трацяць яе на сцэне.

Так, спектаклі з удзелам народнай артысткі Беларусі Зінаіды Браварскай і зараз не сыходзяць са сцэны Купалаўскага тэатра. А на сваім бенефісе (спектакль «Смех лангусты» па п'есе Джона Марэла, роля французскай актрысы Сары Бярнар) Зінаіда Іванаўна паабяцала, што спакою сваім прыхільнікам не дасць. І пасля святкавання свайго юбілею прынесла ў тэатр п'есу Д. Коўберна «Гульня ў джын», якая пазначана зараз у афішы Купалаўскага тэатра як прэм'ера.

Наталля ВАЛАКІДА.

НА КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

ДЗЕ ПАЛЮЮЦЬ ЛАНГАЛЬЕРЫ?

Стывен Кінг — адзін з вядомых майстроў раманаў жахаў, аўтар зборнікаў апавяданняў «Начная змена», «Розныя часы», раманаў «Кэры», «Могілкі хатніх жывёл», «Зззянне», «Мёртвая зона», «Тая, што нясе агонь» і іншых твораў. Звычайнаму чытачу бачыцца ў ім воблік старога, што жыве ў адзіноце ў старым замку і піша свае кашмары. На самай справе Стывену толькі 45 гадоў.

Нягледзячы на гэта, ён ужо знакаміты, асабліва пасля выхаду ў свет рамана «Празорца», напісанага С. Кінгам у 1977 г. і экранізаванага Стэнлі Кубрынам у 1980 г.

С. Кінгам напісаны і класічныя раманы жахаў, у якіх ва ўзаемаадносіны чалавека з навакольным асяроддзем умешваецца яшчэ і нешта таямнічае і містычнае, як гэта адбываецца ў раманах «Тая, што нясе агонь», «Могілкі хатніх жывёл». Яго пяру належаць і псіхалагічныя драмы, у якіх праблемы рэальнага жыцця вызначаюцца пры дапамозе звышнатуральных сілаў («Зззянне», «Мізеры», «Мёртвая зона»), і раманы, дзе галоўнымі героямі з'яўляюцца дзеці «Могілкі хатніх жывёл», «Зззянне»).

Я хачу пазнаёміць чытачоў з адным з апошніх яго твораў, аповесцю «Лангальеры», якая выйшла ў 1992 годзе ў зборніку «Чвэрць пасля паўночы». Гэта аповесць атрымала такую назву па той прычыне, што размова ў ёй ідзе аб цывілізацыі жахлівых разумных пачвар — лангальераў, якія палююць за гультаяватымі дзецьмі. Гэтая аповесць падобна на іншыя яго раманы і аповеды духам містыкі. Не выпадкова цэнтральным вобразам у «Лангальерах» з'яўляецца жанчына — дух, якая закрывае рукой трэшчыну ў пасажырскім авіялайнеры. Пасажыры бінга-767, якія трапілі ў часовы разрыў і не ведаюць гэтага, аказаліся ў даволі дзіўнай сітуацыі: аэрапорт, у якім яны прызямліліся пусты, ежа не мае смаку, а паветра — паху. Бакі амаль пустыя. Адзіны гук, які чутны ў цішы — гадкае, хрусткае чмяканне галодных лангальераў, які ўзмацняецца з кожнай хвілінай. У многіх творах Кінга дзеці — галоўныя дзеючыя асобы. Яны ўспрымаюць тое, што адбываецца вакол іх дарослых. Асабліва калі яны надзелены незвычайнымі здольнасцямі. Як дзяўчынка са звышнатуральным слыхам з аповесці «Лангальеры». У ёй размова ідзе пра самыя простыя рэчы — сяброўства, узаемадапамогу, еднасць.

Апошнім часам у творах, напісаных Кінгам, назіраецца паўтаральнасць сюжэту. Характэрным прыкладам з'яўляецца аповесць «Лангальеры», якая нагадвае няўлоўна раман «Зззянне». Але нягледзячы на ўсе недахопы аповесці, тонкі стыль выкладання, удала закручаны дэтэктыўны сюжэт у злучанасці з элементамі містыкі і атмасфера псіхалагічнага ўздзеяння, на мой погляд, выгадна адрозніваюць аповесць ад іншых твораў гэтага жанру.

Алег ШЭЛЕСТ,
студэнт факультэта журналістыкі.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

220079, 1-ы Загарадны зав., 3.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВІПА імя Я. Коласа.

10 чэрвеня
Зак. 1705.
Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.